# УЗАЕМАСУВЯЗІ МАЦНЕЮЦЬ

Не так даўно наш універсітэт прымаў дэлегацыю студэнтаў і выкладчыкаў з Наўгародскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Яраслава Мудрага. Трэба сказаць, што сяброўства паміж навучальнымі ўстановамі доўжыцца ўжо больш за 10 гадоў. Абодва ўніверсітэты неаднаразова выступалі партнёрамі па праектах у рамках еўрапейскай праграмы TEMPUS.







Сёлета наўгародская дэлегацыя была самая шматлікая за гады сяброўства – 32 студэнты і 9 выкладчыкаў. А гэта сведчыць пра тое, што расіяне і беларусы зацікаўлены ў абмене вопытам.

Як адзначыў прарэктар па вучэбнай рабоце нашай ВНУ Веслаў Іосіфавіч Туркоўскі, дэлегацыя з Ноўгарада прыехала ў Віцебск, каб пазнаёміцца з сістэмай вышэйшай адукацыі Беларусі на прыкладзе нашага ўніверсітэта.

Наўгародскія студэнты былі размеркаваны паміж факультэтамі ў адпаведнасці са сваімі спецыяльнасцямі. На базе факультэтаў прайшлі круглыя сталы, майстар-класы і семінары-трэнінгі. Акрамя гэтага, у рамках візіту адбыліся спартыўная сустрэча па валейболе, канцэрт, а таксама адкрыццё сумеснай выставы творчых прац на мастацка-графічным факультэце. Для студэнтаў з суседняй краіны правялі экскурсію, пазнаёмілі са славутасцямі горада і раёна.

Па выніках візіту складзена і падпісана «Дарожная карта» па рэалізацыі далейшых сумесных задум і праектаў. Напрыклад, будзе абмяркоўвацца магчымасць абмену студэнтамі паміж універсітэтамі на семестр, будуць удакладняцца вучэбныя планы для ўзаемадзеяння па стварэнні двайнога дыплома.

Напрыканцы развітальнай сустрэчы госці і машэраўцы абмяняліся сувенірамі, а наўгародскім студэнтам уручылі сертыфікаты.

**Андрэй ШЧАРБІЦКІ.**
**Фота аўтара**
**і В. ЛУЗГІНОЙ.**